ПРАДМОВА

# Паміж двух агнёў

Традыцыя выдання адмысловых «ваенных» нумароў часопіса «ARCHE» налічвае ўжо больш за дзесяцігоддзе, і да гэтага часу іх было выдадзена ўжо чатыры (№ 2 за 1999 год, № 5 за 2008 год, № 5 і 7—8 за 2010 год). Усе гэтыя выданні выклікалі несумненную чытацкую зацікаўленасць, што і не дзіўна — падзеі Другой сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі і пытанне іх ацэнкі займаюць прыкметнае месца як у афіцыйнай, так і ў альтэрнатыўных ёй канцэпцыях гістарычнай памяці. Да таго ж гэтая гістарычная падзея храналагічна ад нас пакуль яшчэ не так і далёка (пэўная частка яе непасрэдных сведкаў яшчэ жывуць на гэтым свеце), таму пры яе асэнсаванні пакуль што не заўсёды проста абстрагавацца ад эмоцый і перайсці да чыста навуковага аналізу.

Нягледзячы, аднак, на ўсе аб'ектыўныя і суб'ектыўныя цяжкасці, апошнія дзесяцігоддзі былі для вывучэння гісторыі Другой сусветнай вайны перыядам надзвычай плённым. Пасля краху камуністычнага рэжыму ў СССР і суседніх з ім дзяржавах Усходняй Еўропы навукоўцы з розных краін нарэшце атрымалі магчымасць карыстацца многімі крыніцамі, раней ім недаступнымі дзеля ідэалагічных меркаванняў. У выніку гэтага сёння мы маем магчымасць больш глыбокага пераасэнсавання таго трагічнага перыяду нашай гісторыі, больш аб'ектыўнай і ўзважанай яго ацэнкі.

Перыяд нямецкай акупацыі стаў сапраўдным выпрабаваннем для простых жыхароў вёсак, мястэчак і гарадоў Беларусі. Можна бясконца дыскутаваць адносна таго, кожны чацвёрты ці кожны трэці яе жыхар стаў ахвярай гэтага найбуйнейшага глабальнага катаклізму XX ст. — несумненна, аднак, што лік гэтых ахвяраў у любым выпадку ідзе на мільёны чалавек. Асаблівая жорсткасць і брутальнасць вайны на Усходзе тлумачылася перадусім тым, што гэтая тэрыторыя стала своеасаблівым полем для супрацьстаяння двух антыгуманных таталітарных рэжымаў, якія ў той час дасягнулі піку сваёй магутнасці: бальшавіцка-камуністычнага на чале з Іосіфам Сталіным у СССР і нацысцка-фашысцкага на чале з Адольфам Гітлерам у Германіі. Гістарычна непазбежная вайна, якая ў рэшце рэшт разгарнулася паміж гэтымі рэжымамі, стала для насельніцтва акупаваных тэрыторый сапраўдным кашмарам. Гэтае насельніцтва фактычна апынулася паміж двух аднолькава пякучых і смерта-

носных агнёў, і простае фізічнае выжыванне ў такіх умовах часта рабілася магчымым толькі дзякуючы шчасліваму выпадку, а не свядома абранай стратэгіі паводзін. Сітуацыя, калі днём адной і той жа сям'і даводзілася ратавацца ад бясчынства немцаў і паліцаяў, а ноччу даваць адпор ужо іхным ідэйным апанентам з ліку савецкіх партызанаў, не была рэдкай і выключнай — пра такое яшчэ і цяпер можна пачуць расповеды ад старажылаў у любым кутку Беларусі. Найбольш жа жудаснымі старонкамі той вайны, простае апісанне якіх і сёння прымушае здрыгануцца любога неабыякавага да людскіх пакутаў чалавека, былі бязлітасныя карныя акцыі супраць цэлых групаў людзей, вінаватых толькі ў тым, што воляй лёсу належалі да пэўнай нацыянальнай ці сацыяльнай групы або проста апынуліся ў неналежны час у неналежным месцы. Яшчэ большага трагізму становішчу дадавала тое, што ў спецыфічных умовах таго часу зусім звычайнай была сітуацыя, калі ў ролі катаў і ахвяраў апыналіся колішнія добрыя суседзі, сябры, а нярэдка таксама далёкія ці нават і блізкія сваякі. Сітуацыя, якая наўрад ці магла б скласціся ў тым выпадку, калі б вайна з абодвух асноўных бакоў, якія сутыкнуліся паміж сабой, не насіла такога татальнага, бескампраміснага і антыгуманнага характару.

Тэксты, уключаныя ў гэтае выданне, у большасці сваёй прысвечаныя якраз адлюстраванню розных бакоў вышэйадзначаных аспектаў гісторыі Беларусі пад нямецкай акупацыяй у 1941—1944 гг. Тут ёсць як публікацыі, прысвечаныя праблемам нацысцкага тэрору, здзяйснянага немцамі пры дапамозе сваіх прыхільнікаў з ліку мясцовага насельніцтва ў мэтах «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання» ці пад шыльдай змагання з партызанскім рухам, так і тэксты, прысвечаныя зусім няпростым узаемаадносінам мясцовага насельніцтва з партызанамі, якія фармальна мусілі быць ягонымі абаронцамі, але на практыцы дзейнасць якіх нярэдка дадаткова ўскладняла і без таго няпростае мірных жыхароў. У той жа час варта адзначыць, што і адназначная дэманізацыя падпольнага ды партызанскага антыфашысцкага руху, якую ў апошні час можна сустрэць на старонках некаторых выданняў перадусім папулярнага характару, не можа быць апраўданай, паколькі рашэнне вельмі многіх людзей аб асабістым далучэнні да гэтага руху было выклікана перш за ўсё непрыманнем бязлітасных рэалій нямецкай акупацыйнай палітыкі. Пра гэта выразна сведчаць, напрыклад, упершыню без скарачэнняў апублікаваныя ў гэтым выданні прыватныя дзённікавыя запісы Кастуся Ярмілава — кіраўніка моладзевай антыфашысцкай групы, якая дзейнічала ў 1942 г. у мястэчку Калінкавічы. У роздумах гэтага юнака няма савецкай артадаксальнасці, затое ёсць шчырая занепакоенасць далейшым лёсам роднага краю.

Спадзяемся, што тэматычны зборнік знойдзе свайго неабыякавага чытача, і загадзя ўдзячныя за выказванне канструктыўных заўваг, якія будуць па магчымасці ўлічвацца пры падрыхтоўцы іншых падобных выданняў.

*Аляксандр Пашкевіч*